Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 4 (121), 2020

*УДК 272:94(476.5)*

# Парафія Нараджэння Маці Божай у Браславе у XX–XXI стст.

К.В. Лаўрыненка

У артыкуле разглядаецца гісторыя рыма-каталіцкай парафіі Нараджэння Маці Божай у Браславе ў XX–XXI стст., дзе знаходзіцца санктуарый Маці Божай Валадаркі азёр. Парафія паўстала на пачатку XV стагоддзі, калі быў пабудаваны першы касцёл. Сённяшні касцёл набыў канчатковы выгляд у 1897 г. Шмат выпрабаванняў выпала на долю вернікаў і святароў парафіі ў пачынаючы з 1940-ых гг. Найбольш значную памяць пра сябе аставіў нязломны ксёндз Чэслаў Вільчынскі, які заўчасна памёр у выніку цкаванняў за сваю душпастырскую дзейнасць. З XIX ст. у касцёле знаходзіцца цудатворны абраз Маці Божай. У 1999 г. касцёл быў аб'яўлены санктуарыем Маці Божай Валадаркі азёр. У 2009 г. цудатворны абраз быў каранаваны папскімі каронамі.
**Ключавыя словы:** касцёл, ксёндз, парафія Браслаў, ксёндз Чэслаў Вільчынскі, біскуп Алег Буткевіч, абраз Маці Божай, санктуарый Маці Божай Валадаркі азёр.

The article is concerned with the history of the Roman Catholic Nativity of the Blessed Virgin Mary parish in Braslau in the XX–XXI centuries, where the sanctuary of Our Lady Queen of the Lakes is situated. The parish was founded at the beginning of the 15th century when the first church was built. The contemporary church was finished in 1897. The lay faithful and the clergy of the parish were afflicted greatly during 1940s and later. The most prominent of them was unbending Fr. Czesław Wilczyński who met an untimely end due to the persecutions for his pastoral activity. There was a miracle-working icon of Our Lady in the church from the19th century. In 1999 the church was declared a sanctuary of Our Lady Queen of the Lakes. In 2009 the icon was crowned with papal crowns.
**Keywords:** church, priest, parish of Braslau, Fr. Czesław Wilczyński, Bp. Aleh Butkevich, icon of Our Lady, sanctuary of Our Lady Queen of the Lakes.

Браслаўская парафія Нараджэння Маці Божай з'яўляецца адной з настарэйшай на тэрыторыі Беларусі. Яна паўстала на пачатку XV ст., дзякуючы Войцеху Манівіду, Віленскаму ваяводу, які выступіў фундатарам парафіяльнага касцёла.

Сёння парафія у Браславе вядома перадусім як месца, дзе знаходзіцца санктуарый Маці Божай Валадаркі Азёраў, у якім маецца цудатворны абраз Маці Божай, каранаваны папскімі каронамі.

Мэта артыкула – разгледзець гісторыю парафіі Нараджэння Маці Божай у Браславе ў XX–XXI стст.

Даследаванне пабудавана на выкарыстанні шырокага кола дакументаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, а таксама навуковых публікацый, што дазволіла разгледзець гісторыю парафіі Нараджэння Маці Божай у Браславе ў XX–XXI стст.

Метадалагічную аснову публікацыі склалі прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці. У даследаванні выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя, так і спецыяльна-гістарычныя метады.

Першая каталіцкая святыня ў Браславе была пабудавана каля 1423 г. [1, s. 63]. Затым на працягу стагоддзяў будынак касцёла некалькі разоў знішчаўся, пасля чаго адбудоўваўся.

Сучаснае аблічча браслўскі касцёл набыў у 1897 г., калі пробашч парафіі Франіцішак Бірутовіч здзейсніў грунтоўную перабудову святыні, пабудаванай у 1824–1826 гг. ля падножжа Замкавай гары, дзякуючы высілкам ксяндза Ігнацыя Навіцкага.

У чэрвені 1906 г. касцёл быў кансэкраваны біскупам Гаспарам Цыртаўтам, суфраганам Жмудскім [2, s. 22].

З пачатку ўтварэння парафія знаходзілася ў складзе Віленскай дыяцэзіі, у 1849–1924 гг. – Цяльшайскай (Жмудскай) дыяцэзіі, у 1925 г. увайшла ў склад Віленскай архідыяцэзіі. Калі ў 1901 г. парафія налічвала 17100 вернікаў [3, s. 213], то ўжо ў 1926 г. – 6000 [4, s. 44]. Колькасць вернікаў зменшылася ў выніку зменаў межаў парафіі. У 1939 г. у парафіі налічвалася 5832 вернікі [5, s. 47].

У міжваенны час пробашчамі парафіі былі: у 1920–1924 гг. – ксёндз Зянон Даўкша, у 1924–1931 гг. – ксёндз Юзаф Савіцкі, у 1931–1933 гг. – ксёндз Ежы Жамейць.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

21 лютага 1933 г. пробашчам парафіі стаў ксёндз Мечыслаў Акрэйць. Святар памёр 25 чэрвеня 1942 г., ва ўзросце 58 гадоў, у час, калі ў Браславе праходзіла акцыя нямецка-фашысцкіх захопнікаў па вынішчэнні яўрэйскага гета. Па адной версіі, святар памёр у выніку сардэчнага прыступу на прыступках плябаніі, акружаны яўрэямі, якія шукалі тут паратунку. Па другой – святар быў забіты стрэлам у сэрца. У апошнія хвіліны свайго жыцця святар паказваў кірунак уцёкаў для гэтых людзей, якім відавочна і раней дапамагаў [6, s. 14]. Пасля яго смерці пробашчам стаў ксёндз Антоній Шубзда, які дагэтуль выконваў абавязкі вікарыя [7, Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 96. Арк. 6–9].

Пасляваенныя гады для парафіі былі вельмі цяжкімі. Уначы з 25 на 26 мая 1948 г. у выніку пажару згарэла плябанія (дом святара) і два сараі [8, Ф. 952. Воп. 2. Спр. 14. Арк. 11]. Застаўшыся без даху над галавой, ксёндз Шубзда атрымаў дапамогу ад мясцовага праваслаўнага святара, у якога жыў на працягу трох месяцаў [8, Ф. 952. Воп. 2. Спр. 19. Арк. 103].

У жніўні 1949 г., ратуючыся перад пагрозай арышту, ксёндз Антоній Шубзда пакінуў парафію [8, Ф. 952. Воп. 1. Спр. 23. Арк. 218]. Ён схаваўся ў в. Агоні на тэрыторыі парафіі, дзе знаходзіўся да 1955 г. на нелегальным становішчы [9, s. 570]. Перажыць гэты нялёгкі час святару дапамаглі манахіні Кангрэгацыі Сясцер Служак Езуса ў Еўхарыстыі (эўхарысткі), якія служылі на тэрыторыі браслаўскай парафіі. У 1955 г. святар быў арыштаваны, але неўзабаве вызвалены.

Нават застаўшыся без пастыра, вернікі ўсё роўна збіраліся у касцёле, праводзячы адмысловыя набажэнствы самастойна, без святара. Кіравала імі манахіня еўхарыстка Разалія Марціленак, якая працавала ў касцёле арганісткай [10, s. 172]. Вялікую ролю адыграў і касцельны камітэт. У касцёл вернікі збіраліся ў нядзелю і вялікія рэлігійныя святы. Напрыклад, 29 студзеня 1949 г. у нядзелю ў касцёле прысутнічала 78 жанчын, 40 мужчын і 26 чалавек моладзі. Па іншыя сакрамэнты, такія як хрэсьбіны, вянчанне і споведзь, вернікі браслаўскай парафіі звярталіся ў тыя касцёлы, дзе меўся святар. Пахаванні вернікі праводзілі без святара, спяваючы рэлігійныя песні і з крыжам праводзячы нябожчыка на могілкі. У значнай частцы браслаўскай парафіі вернікі збіраліся на ружанцовыя малітвы. Некаторыя вернікі ў гэты час наведвалі праваслаўную царкву [8, Ф. 952. Воп. 1. Спр. 19. Арк. 1–2].

Адначасова вернікі шукалі новага святара ў парафію. У лютым 1950 г. парафіяне даслалі просьбу да ўпаўнаважанага Савета па справах рэлігійных культаў дазволіць служэнне ў браслаўскім касцёле ксяндзу Балтазару Будрэцкаму з Літвы, які раней служыў у Лявонпалі, а на той час жыў у вёсцы Васевічы. Аднак дазволу на гэта вернікі не атрымалі [8, Ф. 952. Воп. 1. Спр. 21. Арк. 6, 6 аб].

Неўзабаве мясцовыя ўлады зачынілі касцёл і перадалі яго пад склад збожжа. Рашэннем браслаўскага райвыканкама культавая маёмасць касцёла была выстаўлена на продаж, што з’яўлялася грубым парушэннем пастановы Савета Міністраў фінансаў СССР ад 30 ліпеня 1946 г. [8, Ф. 952. Воп. 2. Спр. 27. Арк. 113]. Частка літургічнага начыння была здадзена як каляровы металалом, другая частка літургічных рэчаў, у тым ліку арнаты, здадзена як анучы.

Тым часам вернікі змагаліся за вяртанне сваёй святыні. 24 красавіка 1952 г. яны даслалі заяву, у якой прасілі вярнуць ім касцёл, вызваліўшы яго ад збожжа [8, Ф. 952. Воп. 1. Спр. 30. Арк. 21]. Аднак, нягледзячы на пастанову Савета Міністраў БССР ад 24 красавіка 1952 г., пасля выдання якой вернікі атрымалі 13 ліпеня 1952 г. паведамленне аб вызваленні касцёла [8, Ф. 952. Воп. 1. Спр 30. Арк. 71], старшыня браслаўскага райвыканакама ўсяляк тармазіў вываз збожжа з касцёла. Пасля скаргаў вернікаў у справу быў вымушаны ўмяшацца намеснік упаўнаважанага Савета ў справах рэлігійных культаў пры Савеце Міністараў БССР тав. Ярашэвіч, які ў жніўні выязджаў у Браслаўскі раён. Тав. Ярашэвічу старшыня браслаўскага райвыканакама заявіў, што ў касцёле знаходзіцца 70–80 тон збожжа і яго няма куды вывозіць. Аднак дырэктар райканторы «Нарыхзерне» паведаміў, што як толькі старшыня райвыканакама дасць загад вывезці зерне, якога, дарэчы, у касцёле было толькі каля 7 тон, гэта будзе зроблена на працягу 2-х гадзін. Пры гэтым у размове з тав. Ярашэвічам старшыня браслаўскага райвыканакама і не хаваў, што ён проста не жадае вяртаць касцёл вернікам. У выніку толькі пасля ўмяшальніцтва старшыні аблвыканкама касцёл быў вернуты парафіі [8, Ф. 952. Воп. 2. Спр 34. Арк. 64–65].

Нарэшце 28 жніўня 1952 г. касцёл быў вызвалены з-пад склада «Нарыхтзерне» і 29 жніўня быў перададзены вернікам [8, Ф. 952. Воп. 2. Спр 34. Арк. 65]. Вось як успамінае пра гэта манахіня еўхарыстка Апалонія Пяткун: «Сабралася мноства людзей, прыйшоў начальнік з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

ключамі, адамкнуў святыню, людзі ўвайшлі ў яе, укленчылі і голасна плакалі. Напэўна, начальнік спалохаўся, бо касцёл быў у кепскім стане. Відаць, ён думаў, што яму за гэта могуць учыніць крыўду, але не – людзі плакалі і дзякавалі» [10, s. 173]. Нягледзячы на тое, што сама святыня была ў дрэнным стане, аднак цудатворны абраз Маці Божай, які з XIX ст. знаходзіўся у касцёле, не быў пашкоджаны. Таксама на месцы засталіся і ўсе воты, змешчаныя вакол абраза.

25 кастрычніка 1952 г. улады зарэгістравалі ў парафіі ксяндза Франца Свёнтэка CsRS, які прыехаў з Вільнюса. Святар быў інвалідам і перамяшчаўся ў інвалідным вазку, аднак і ў такім стане быў небяспечны для савецкай улады. Па звестках упаўнаважанага Савета ў справах рэлігійных культаў ксёндз Свёнтэк пісаў «мемуары і іншыя працы антысавецкага характару». У лютым 1957 г. пры выездзе на сталае месца жыхарства ў Польшу на цэльні ў Брэсце у Адэлі Радзевіч был канфіскаваны чатыры агульныя сшыткі, якія жанчына па просьбе святара везла ў Польшчу, каб перададаць прафесару Голдзе(?) для публікацыі ў каталіцкай прэсе Польшчы ці ў іншай краіне.

Напрыканцы красавіка 1957 г. на кватэры святара і ў браслаўскім касцёле быў праведзены вобыск, падчас якога, як пісаў упаўнаважаны, была знойдзена «вялікая колькасць антысавецкай літаратуры на польскай мове выдання былой буржуазнай польскай дзяржавы і перыяду нямецкай акупацыі». Акрамя гэтага, у святара было забрана каля 1000 лістоў рукапісу, па меркаванні ўпаўнаважанага, «рэзка антысавецкага характару» [8, Ф. 952. Воп. 4. Спр. 17. Арк. 29–30]. Усе гэта дало ўладам падставы пазбавіцца невыгоднага святара. У маі 1958 г. «за нелаяльныя адносіны да савецкай улады» святар быў пазбаўлены права служэння ў браслаўскім касцёле і зняты з рэгістрацыі [7, Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 96. Арк. 27], пасля чаго быў вымушаны выехаць з Браслава. Браслаўская парафія зноў засталася без пробашча.

Аднак у гэты час у Браславе знаходзіўся іншы святар – ксёндз Антоній Шубзда, які пасля знаходжання на нелегальным становішчы і кароткатэрміновага арышту ўжо на працягу двух гадоў знаходзіўся ў парафіі без рэгістрацыі, што азначала забарону на служэнне ў касцёле. Яшчэ 24 лютага 1957 г. у трох заявах ад імя ксяндза Свёнтэка, ксяндза Шубзды і вернікаў яны прасілі зарэгістраваць ксяндза Шубзду ў якасці другога святара ў браслаўскім касцёле [8, Ф. 952. Воп. 3. Спр. 13. Арк. 112, 113, 114]. Аднак згоды на гэта ўпаўнаважаны не даў. Больш таго, каб пазбыцца гэтага святара з Браслава, 15 сакавіка 1958 г. яго зарэгістравалі другім святаром у парафію Дзераўная Івянецкага раёна [8, Ф. 952. Воп. 3. Спр. 12. Арк. 22].

26 чэрвеня 1958 г. новым пробашчам у браслаўскай парафіі быў зарэгістраваны ксёндз Ян Завістоўскі [7, Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 96. Арк. 36]. У свой час гэты святар служыў у парафіі Параф'янава, дзе ў 1951 г. быў арыштаваны і асуджаны судом Полацкай вобласці паводле артыкулаў 76 і 72-8 КК БССР на 10 гадоў лагераў. Ужо 23 чэрвеня 1954 г. святар быў вызвалены з лагера, пасля чаго вярнуўся ў сваю парафію. Аднак у выніку канфлікту з касцельным камітэтам ксёндз Завістоўскі пераехаў у Браслаў [9, s. 667].

8 чэрвеня 1967 г. ксёндз Завістоўскі памёр і вернікі вымушаны былі шукаць новага святара. У жніўні вернікі парафіі нарэшце дабіліся дазволу, каб пробашчам быў зарэгістраваны ксёндз Чэслаў Вільчынскі, які дагэтуль на працягу сямі гадоў чакаў на прэзбітарскае пасвячэнне.

Чэслаў Вільчынскі нарадзіўся 6 студзеня 1928 г. у вёсцы Адамушкі плюскай парафіі, суседняй з браслаўскай, у сялянскай сям'і. Першапачатковую адукацыю з 1937 г. атрымаў у мясцовай школе ў Плюсах, пасля працягнуў адукацыю, перарваную ў ваенныя гады, у сярэдняй школе ў Даўгаўпілсе. У 1949 г. працаваў рахунказодам у Плюскай сямігадовай школе, затым быў прызваны ў войска. У Полацку з дазволу афіцэра юнак выйшаў з цягніка, каб купіць харчаванне, але спазніўся, у выніку быў арыштаваны і ў паказальным працэсе ў Докшыцах асуджаны Ваенным трыбуналам па артыкуле 193 КК РСФСР на 10 гадоў турмы. Пасля апеляцыі тэрмін зняволення быў зніжаны да 5 гадоў, а за добрую працу ў турме яшчэ на 1,5 года. Пасля вяртання са зняволення ў 1952 г. Чэслаў Вільчынскі выразіў жаданне вучыцца ў Духоўнай семінарыі ў Рызе, аднак не атрымаў на гэта дазволу Савета ў справах рэлігійных культаў. У выніку да святарства юнак пачаў рыхтаваца самастойна, адначасова працуючы з 1952 г. рабочым на заводзе. Нарэшце ў 1955 г. юнак быў прыняты ў семінарыю, якую скончыў у 1959 г. Аднак, атрымаўшы духоўную адукацыю і неабходную фармацыю,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

юнак не атрымаў згоды на прэзвітарскае пасвячэнне ад Савета па справах рэлігійных культаў. З 1960 г. ён жыў у Рызе, працаваўшы спачатку ўпакоўшчыкам, затым з 1963 г. – сталяром дрэваапрацоўнага камбіната [9, s. 634–636], [7, Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 96. Арк. 81–86].

У 1963 г. Чэслаў Вільчынскі і мясцовыя вернікі прасілі дазволу ўпаўнаважанага зарэгістраваць яго ў Лынтупскім касцеле, але атрымалі адмову. Тое ж самае атрымалася і калі Чэслаў Вільчынскі паспрабаваў зарэгістравацца ў касцелах у в. Параф'яна і ў в. Лучай Пастаўскага раёна [7, Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 18. Арк. 13, 60, 61, 63, 66].

Толькі ў 1967 г. Чэслаў Вільчынскі атрымаў дазвол упаўнаважанага на прэзвітэрскае пасвячэнне, атрымаўшы яго 17 верасня 1967 г. у рыжскім саборы св. Якуба [7, Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 96. Арк. 86].

З 1 кастрычніка 1967 г. ксёндз Чэслаў Вільчынскі распачаў служэнне ў браслаўскім касцёле. Ужо зарэгістраваўшы ксяндза Вільчынскага ў Браславе, упаўнаважаны зразумеў, што зрабіў памылку, даўшы яму дазвол на працу ў адной з найбуйнейшых парафій, паколькі ўлады вельмі баяліся ажыўлення рэлігійнага жыцця ў гэтай мясцовасці. Упаўнаважаны прапанаваў ксяндзу Вільчынскаму перайсці ў парафію Лучай, але той адмовіўся [7, Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 9. Арк. 4].

У пасляваенны перыяд браслаўская парафія была адной з найбольш моцных на тэрыторыі Беларусі. Гэта быў рэгіён з трывалымі каталіцкімі традыцыямі, а браслаўскі касцёл наведвалі вернікі больш чым 10 перадваенных парафій, якія не дзейнічалі ў выніку арышту ксяндзоў напрыканцы 1940-х гг. і далейшага закрыцця касцёлаў. У вялікія рэлігійныя святы і ўрачыстасці ў браслаўскім касцёле на Імшы малілася да 2500–3000 вернікаў (дадзеныя 1964 г.) [7, Ф. 4029. Воп. 1. Спр. 18. Арк. 13, 60, 61, 63, 66] і нават да 4000 (дадзеныя 1979 г.) [7, Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 50. Арк. 6]. У 1960 г. ксёндз Ян Завістоўскі паведамляў, што да споведзі ў Вялікі Пост прыступіць каля 6000 чалавек [8, Ф. 952. Воп. 3 Спр. 24. Арк. 64–64аб].

Атрымаўшы рэгістрацыю ў браслаўскім касцёле, ксёндз Чэслаў Вільчынскі вельмі горача ўзяўся за працу. Ужо ў 1967 г. святар правёў у касцёле грунтоўны рамонт. Яго самаахвярная праца прывяла да ажыўлення рэлігійнага жыцця ў Браславе і ваколіцах. Святар актыўна дастасоўваўся да патрэбаў часу. Так, нягледзячы на тое, што заўсёды чытанне Евангелля і казанні ў час Імшы былі на польскай мове, падчас службы на Вялікдзень у 1979 г. урывак з Евангелля ксёндз прачытаў на рускай мове [7, Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 50. Арк. 10].

Вельмі дбаў ксёндз Вільчынскі аб катэхізацыі дзяцей, якую ў парафіі таемна праводзілі сёстры эўхарысткі. У 1977 г. у браслаўскай парафіі 250 дзяцей урачыста прынялі Першую святую Камунію, што было нечаканым здарэннем для ўсяго СССР [9, s. 635]. У свята Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі 15 жніўня 1979 г. толькі на адной Імшы, на якой прысутнічала каля 1000 вернікаў, было 100 дзяцей [7, Ф. 1439. Воп. 2. Спр. 50. Арк. 34].

Усё гэта выклікала вострую рэакцыю мясцовых, абласных і рэспубліканскіх улад. Святара пастаянна выклікалі ў абласны і рэспубліканскі Савет па справах рэлігійных культаў, дзе пагражалі яму і шантажавалі. У прэсе, у прыватнасці, у абласной газеце «Віцебскі рабочы» і мясцовай раённай рэгулярна друкаваліся артыкулы, у якіх ксяндза Вільчынскага палівалі брудам. Неаднаразова святара здымалі з рэгістрацыі за «парушэнне савецкага заканадаўства аб культах». Але вернікі вельмі горача баранілі свайго пастыра. Так, у жніўні 1975 г., калі святара ў чарговы раз пазбавілі рэгістрацыі і на верталёце прывезлі ў Віцебск для «разбіральніцтва», мясцовыя калгаснікі-католікі сабраліся ў Браславе і прыгразілі, што калі ксяндзу забароняць служыць, яны спыняць працу на палях у час жніва. У выніку ўлады былі вымушаны вярнуць святару «даведку», якая дазваляла яму служэнне ў браслаўскім касцёле [9, s. 636].

Гэтае цкаванне святара вельмі пагоршыла стан яго здароўя, і 24 жніўня 1986 г. ён памёр у выніку другога інфаркту. Мясцовыя ўлады не згадзіліся на пахаванне ксяндза Вільчынскага побач з касцёлам, але ўначы вернікі таемна выкапалі магілу каля касцёла, дзе і пахавалі святара.

Наступным пробашчам парафіі стаў ксёндз Генрык Акалатовіч, які служыў тут з 19 лістапада 1986 г. да 1988 г. [7, Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 96. Арк. 129], затым – ксёндз Францішак Кісель, чыё служэнне адбывалася з 18 ліпеня 1988 г. да 1992 г. [7, Ф. 1439. Воп. 3. Спр. 96. Арк. 215].

У 1991 г. парафія афіцыйна ўвайшла ў склад Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі, і ў тым жа годзе яе з біскупскай візітацыяй наведаў арцыбіскуп Казімір Свёнтэк. Афіцыйная ж рэгістрацыя парафіі адбылася 24 жніўня 1992 г.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

З 1992 г. душпастырскае служэнне ў парафіі распачалі ксяндзы сальватарыяне. У 1992–1997 гг. пробашчам парафіі быў ксёндз Стэфан Пракурат SDS. Святар памёр 6 студзеня 1997 г. у парафіяльным касцёле адразу пасля св. Імшы ў выніку сардэчнага прыступу, не дажыўшы 11 дзён да свайго 56-годдзя.

Наступным пробашчам парафіі ў 1997–2011 гг. быў ксёндз Лешэк Вітвіцкі SDS, які дагэтуль з кастрычніка 1993 г. быў вікарыем. У 2011–2014 гг. пробашчам парафіі быў ксёндз Антоній Зэмба SDS. У 2014 г. яго змяніў ксёндз Станіслаў Мжыглуд SDS.

Паколькі браслаўскі касцёл з XIX стагоддзя быў вядомы як месца, дзе знаходзіўся цудатворны абраз Маці Божай, у 1999 г. ардынарый новаўтворанай Віцебскай дыяцэзіі біскуп Уладзіслаў Блін прызначыў гэтую святыню Санктуарыем Маці Божай Валадаркі азёраў [11, s. 45].

Гісторыя цудатворнага абраза Маці Божай да 1832 г. была звязана з кляштарам на выспе возера Неспіш, за некалькі кіламетраў ад Браслава, які быў заснаваны на пачатку XV ст. як праваслаўны на сродкі віленскага ваяводы Войцеха Манівіда. Напрыканцы XVI ст. ён стаў уніяцкім кляштарам айцоў базыльянаў, які належаў Кангрэгацыі базыльянаў імя Святой Тройцы ў Вільні. У дакументах кангрэгацыі XVIII ст. можна знайсці пацверджанне знаходжання цудатворнага абраза Маці Божай ў кляштары базыльянаў у Браславе. Там жа маюцца звесткі, што перад абразом Маці Божай, які ў той час называлі Маці Божай Манастырскай, малілася шмат пілігрымаў, якія прыбывалі сюды з розных мясцінаў, аднак месца і час стварэння абраза, а таксама імя мастака, які намаляваў яго, невядомы [12, s. 15].

21 жніўня 1832 г. у кляштар базыльянаў на выспе возера Неспіш патрапіла маланка, якая стала прычынаю вялікага пажару, калі згарэлі касцёл, кляштар, бібліятэка і гаспадарчыя прыбудовы. Абраз Маці Божай ацалеў ад агню і гэта тлумачыцца як праява цуду. Паводле падання, ён быў знойдзены на папялішчы, а затым размешчаны ў касцёле ў Браславе. Аднак паданне не мае гістарычнага пацвярджэння і акалічнасці з'яўлення абраза ў браслаўскай касцёле дагэтуль невядомыя.

З нагоды 10-годдзя ўтварэння Віцебскай дыяцэзіі, якое адзначалася у 2009 г., яе ардынарый біскуп Уладзіслаў Блін звярнуўся да Апостальскай Сталіцы з просьбай, каб Папа Рымскі даў згоду на каранцыю папскімі каронамі абраза Маці Божай у Браславе. 18 лютага 2009 г. падчас аўдыенцыі на плошчы св. Пятра ў Рыме Папа Бэнэдыкт XVI благаславіў новыя кароны для цудатворнага абраза Маці Божай Валадаркі азёраў. Кароны для благаслаўлення прадставілі ксёндз Анджэй Урбанскі SDS, Генеральны настаяцель ксяндзоў сальватарыянаў у Рыме, і ксёндз Антоній Зэмба SDS, дырэктар аддзела замежных місій у Міколаве ў Польшчы [12, s. 15].

Урачыстасць каранацыі абраза адбылася 22 жніўня 2009 г. Узначаліў галоўную святую Імшу і каранаваў абраз ад імя Святога Айца кардынал Ёахім Майснер, Мітрапаліт Кёльнскі з Германіі. У гэтай урачыстасці ўзялі ўдзел 31 біскуп, 200 святароў і каля 20 тысяч вернікаў [13, s. 1].

У санктуарыі Маці Божай Валадаркі Азёраў у Браславе знаходзяцца рэліквіі святога папы Яна Паўла ІІ. Менавіта ў пантыфікат гэтага Папы, які спрычыніўся да адраджэння Касцёла ва Усходняй Еўропе, браслаўскі касцёл быў абвешчаны марыйным санктуарыем. У капліцы Святога Яна Паўла ІІ у касцёле публічна выстаўлены для ўшанавання і пакланення рэліквіярый з крывёй святога Папы. Браслаўскаму санктуарыю рэліквіі былі перададзены кардыналам Станіславам Дзівішам у 2015 г. праз Правінцыяла айцоў сальватарыянаў ксяндза Пятра Філяса SDS. Таксама ў святыні знаходзіцца і асабістая сутана Яна Паўла ІІ. Яна была перададзена ў санктуарый у 2015 г. біскупам Віцебскім Алегам Буткевічам [14].

З браслаўскай парафіі паходзіць другі віцебскі ардынарый біскуп Алег Буткевіч, які атрымаў біскупскае пасвячэнне 18 студзеня 2014 г. У свой час у браслаўскім касцёле Алегу Буткевічу быў удзелены сакрамэнт хросту, тут ён прыняў Першую святую Камунію. У маі 2000 г. новапрэзбітар Алег Буткевіч цэлебраваў тут прымiцыйную Імшу. 2 лютага 2014 г., у свята Ахвяравання Пана, біскуп Буткевіч цэлебраваў у родным браслаўскім касцёле першую Імшу ў якасці іерарха.

8–10 верасня 2018 г. біскуп Віцебскі Алег Буткевіч здзейсніў першую візітацыю браслаўскай парафіі з пачатку свайго служэння. У гэтыя дні іерарх не толькі маліўся разам з вернікамі ў святыні і прапаведаваў ім Божае слова, але і сустрэўся з удзельнікамі розных малітоўных рухаў, наведаў капліцу і хворых у гарадской бальніцы, а таксама жыхароў дома-інтэрната для інвалідаў і састарэлых.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ

У 2019 г. энтузіясты з Браслава вырашылі аднавіць частку гісторыі існавання цудатворнага абраза Маці Божай Браслаўскай. У жніўні некамерцыйная арганізацыя «Цэнтр рэгіянальнага развіцця “Браслаў”» правяла археалагічныя раскопкі на востраве Манастыр на возеры Неспіш, дзе ў свой час знаходзіўся цудатворны абраз. Энтузіясты цэнтра спадзяюцца аднавіць манастыр з усімі пабудовамі і мастом паміж востравам і мацерыком. Кіраўніком прац стаў археолаг Мікалай Плавінскі.

На пачатку рэалізацыі праекта 1 жніўня 2019 г. у браслаўскім санктуарыі Маці Божай Валадаркі азёраў адбылася сустрэча, падчас якой намеснік дырэктара Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Дзяніс Лісейчыкаў прачытаў лекцыю па гісторыі манастыра. Даследчык звярнуў увагу, што гравюра з выявай абраза Маці Божай Манастырскай датуецца 30–40 гг. XVIII ст. Таксама гісторык распавёў, што пашырэнню культу святыні спрыяў браслаўскі архімандрыт Геранім Нерэзій, які ў 1774 г. у друкарні віленскіх базыльянаў выдаў кнігу гамілій пра Божую Маці, прамоўленых у сценах манастыра [15].

За два тыдні раскопак, якія праходзілі з 1 па 15 жніўня, іх удзельнікамі была знойдзена частка падмуркаў манастырскіх пабудоваў. Мяркуецца, што знойдзены фрагмент датуецца канцом XVIII – пачаткам XIX ст. [16].

На сённяшні час санктуарый Маці Божай Валадаркі азёраў, які знаходзіцца ў парафіі Нараджэння Маці Божай у Браславе, з’яўляецца адным з найбольш знаным марыйных санктуарыяў Беларусі. Штогод сюды прыбывае вялікая колькасць паломнікаў як з Беларусі, так і замежжа.

**Літаратура**

1. Ochmański, J. Biskupstwo Wileńskie w Sredniowieczu. Ustrój i uposażenie / J. Ochmański – Poznań : Uniwersytet im. Adama Mickiewicza w Poznaniu, 1972. – 118 s.

2. Fibek, J. Dzieje parafii i klasztorów katolickich na Białorusi : w 2 cz. / J. Fibek. – Łomża : Zakon Braci Mniejszych Kapucynów, Prowincja Warszawska, 2016. – Część 1. Diecezja Witebska. T. II. Zachodnia część diecezji Witebskiej. – 702 s.

3. Directorium Horarum canonicarum et Missarum pro dioecesi Telsensi in annum Domini Communem MCMI. Auctoritate et mandato Excelentissimi, Illustrisimi ac Reverendissimi Domini Miecislai-Leonardi Pallulon, Episcopi Telsensis seu Samogitiensis, editum. Vilnae: Typis Joseph Zawadzski, 1901. – 305 s

4. Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis Vilnensis pro anno Domini 1926. – Vilnae : Typis Joseph Zawadzki, 1926. – 157 s.

5. Catalogus ecclesiarum et cleri archidioecesis Vilnensis pro anno Domini 1939. – Vilnae, 1939. – 210 s.

6. Krahel, T. ks. Ks. Mieczysław Akrejc – dziekan brasławski / T. Krahel // Czas miłosierdzia. – 2001. – № 12. – S. 14.

7. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДзАВВ).

8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ).

9. Dzwonkowski, R. Leksykon duchowieństwa polskiego repreśionowanego w ZSRS 1939–1988 / R. Dzwonkowski. – Lublin : Towarzystwo Naukowe Katolickiego Uniwersytetu Lubelskiego, 2003. – 856 s.

10. Strzelecka, H. Służebnice Jezusa w Eucharystii na terenach Związku Radzieckiego w latach 1945–1991 / H. Strzelecka. – Warszawa, 1994. – 227 s.

11. Rzymsko-Katolicka diecezja Witebska. Schematyzm diecezjalny. Witebsk, 2004. – 240 s.

12. Квяткоўскі, А. SDS, кс. Пра касцёл і абраз Маці Божай у Браславе / А. Квяткоўскі // Ave Maria – 2009. – № 7–8. – С. 14–15.

13. Дубраўскі, Ф. У чоўне да новага жыцця / Ф. Дубраўскі // Ave Maria. – 2009. – № 9. – С. 1

14. Шыдлоўскі, У. SDS, кс. Пра рэліквіі св. Яна Паўла ІІ [Электронны рэсурс] / У. Шыдлоўскі. – Рэжым доступу : https://valadarka.by. – Дата доступу : 01.03.2016.

15. Жылевіч, С. Раскопкі, якія пральюць святло на гісторыю абраза Маці Божай Браслаўскай, благаславіў біскуп Алег Буткевіч [Электронны рэсурс] / С. Жылевіч. – Рэжым доступу : https://catholic.by. – Дата доступу : 03.08.2019.

16. Жылевіч, С. Што знайшлі археолагі на востраве Манастыр, адкуль пачынаўся культ Маці Божай Браслаўскай [Электронны рэсурс] / С. Жылевіч. – Рэжым доступу : https://catholic.by. – Дата доступу : 23.08.2019.

Люблинский католический
университет Иоанна Павла II

Поступила в редакцию 29.04.2020

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф.СКОРИНЫ